# Прыёмы навучання малодшых школьнікаў пісьмоваму пераказу тэксту



**В. І. СВІРЫДЗЕНКА,**
дацэнт кафедры беларускага
і рускага моваазнаўства БДПУ імя М. Танка,
кандыдат педагагічных навук, дацэнт

Значнае месца ў развіцці маўлення навучэнцаў пачатковых класаў займаюць пераказы тэкстаў. Узнаўленне прачытанага — адна з асноўных форм работы школьнікаў з вучэбным матэрыялам і эфектыўны прыём развіцця іх мыслення і маўлення.

Навучанне маўленчай дзейнасці павінна весціся з улікам дзвюх асноўных яе функцый — сродку зносін і мыслення. Каб узнаўленне тэксту працякала як зносіны, у дзіцяці павінна ўзнікнуць патрэбнасць расказаць аб прачытаным іншым. Гэта магчыма толькі калі змест тэксту зацікавіць вучня, выклікае пэўныя адносіны да сябе.

Пісьмовыя пераказы ў пачатковых класах носяць навучальны характар. Пры іх правядзенні вельмі важным з'яўляецца выбар тэксту і вызначэнне тыпу пераказу. Тэкст павінен быць узорным па форме, цікавым па змесце, змястоўным у выхаваўчых адносінах, зразумелым дзецям па мове. Падрабязны пісьмовы пераказ з'яўляецца сродкам: 1) замацавання ў памяці дзіцяці зместу прачытанага ва ўсіх яго дэталях; 2) засваення логікі тэксту-ўзору, яго мовы.

Складанасць пісьмовага выкладу ў параўнанні з вусным, павольны тэмп пісьма навучэнцаў пачатковых класаў абумоўліваюць неабходнасць падбіраць для гэтага віду творчых прац тэксты, невялікія па памеры і простыя па сваёй структуры.

Для пераказаў выкарыстоўваюцца розныя тыпы тэкстаў. Больш лёгкімі для ўзнаўлення лічацца апавядальныя тэксты з наяўнасцю сюжэта. Але пры падрыхтоўцы да сачыненняў-апісанняў неабходна трэніраваць школьнікаў і ў пераказе тэкстаў-апісанняў. Пачынаць навучанне пераказу неабходна з апавядальнага тэксту, у якім ёсць выразны сюжэт. Затым можна вучыць дзяцей пераказваць тэксты, якія ўтрымліваюць элементы апісання і разважання.

Традыцыйна склалася наступная методыка правядзення пісьмовага пераказу:

1. Падбор тэксту, папярэдні аналіз яго настаўнікам з пункту гледжання зместу, кампазіцыі, моўных сродкаў.
2. Уступнае слова настаўніка: мэта пераказу, яго від, кароткая характарыстыка тэксту (тып, тэма, аўтар).
3. Папярэдняе тлумачэнне незразумелых слоў (калі яны ёсць).
4. Чытанне тэксту настаўнікам.
5. Высвятленне незразумелага ў змесце, тлумачэнне кантэкстуальных значэнняў незразумелых слоў.
6. Праца над зместам тэксту (тэма, асноўная думка, мікратэмы, апорныя словы).
7. Вызначэнне тыпу тэксту, аналіз яго кампазіцыі (апавяданне (пачатак дзеяння, развіццё падзей, развязка), апісанне (прадмет апісання, яго асноўная прымета, дэталі)).
8. Складанне плана тэксту.
9. Праца над моўнымі сродкамі тэксту (сродкі выразнасці, тыпы сказаў, цяжкія ў арфаграфічных адносінах словы).
10. Вусны пераказ тэксту.
11. Напісанне пераказу [3, с. 329].

Гэты пералік этапаў працы з тэкстам можа вар'іравацца, відазмяняцца, скарачацца.

Пры падрыхтоўцы навучэнцаў да пісьмовага пераказу настаўніку неабходна імкнуцца папярэдзіць магчымыя недахопы. Найбольш распаўсюджаныя — няўменне пачаць тэкст; падрабязнае і дакладнае ўзнаўленне першых частак і скажэнне заключных; рэзкае збядненне мовы [2, с. 92].

Першую фразу многія дзеці імкнуцца завучыць, паколькі перакананы, што пачаць сваімі словамі немагчыма. Неабходна вучыць іх пачынаць тэкст па-свойму. Другі недахоп пераказу папярэджваецца грунтоўным аналізам усяго тэксту, асабліва яго галоўных частак, якія рэдка бываюць размешчаны ў пачатку. Зрабіць пераказ раўнамерным дапамагае падзел тэксту на часткі, складанне плана і пераказ па частках. Апавядальнік бывае вымушаны выдзеліць галоўнае ў кожнай частцы і пераказаць кожную частку больш падрабязна. Каб не дапусціць збяднення мовы, неабходна працаваць над слоўнікам, сродкамі выразнасці, выкарыстанымі ў тэксце, над сказам.

Праца над падрабязным пісьмовым пераказам ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання пачынаецца з **II класа**. Дзецям можна прапанаваць наступны тэкст:

### *Ноч у лесе*

*Цемра паступова апускаецца на зямлю. У лесе змаўкаюць птушкі. Засынае ў сваім гняздзе рыжая вавёрка. Хаваецца ў дупло працавіты дзяцел. У гэты час прачынаецца сава. Выходзіць на паляванне драпежная рысь. Лес паступова напаўняецца таемным шумам і шоргатам. (40 слоў)*

Тэкст чытаецца навучэнцам не больш за два разы. Праводзіцца гутарка (яе прызначэнне — дабіцца поўнага ўсведамлення прачытанага). Першапачаткова пытанні ставяцца да кожнага сказа ў тэксце (пытанні можна запісаць на дошцы, а побач размясціць апорныя словы) і фармулююцца так, каб падказаць вучням аснову для адказу. У кожным сказе можа быць выдзелена слова, з якога трэба пачаць адказ.

| **Пытанні** | **Апорныя словы** |
|---|---|
| *Куды апускаецца **цемра**?* | *на зямлю* |
| *Хто змаўкае **ў лесе**?* | *птушкі* |
| *Хто **засынае** ў сваім гняздзе?* | *вавёрка* |
| *Куды **хаваецца** працавіты дзяцел?* | *у дупло* |
| *Хто прачынаецца **ў гэты час**?* | *сава* |
| *Хто **выходзіць** на паляванне?* | *рысь* |
| *Чым напаўняецца **лес**?* | *шумам і шоргатам* |

Потым кожны сказ або некалькі сказаў могуць быць запісаны на дошцы і ў сшытках.

Пераказу дапамагаюць іншыя маўленчыя практыкаванні, напрыклад, складанне сказаў, аднаўленне дэфармаванага тэксту.

Наступным крокам у развіцці звязнага пісьмовага маўлення з'яўляецца **пераказ тэксту другакласнікамі** па пытаннях, якія ставяцца да часткі тэксту і не падказваюць будову сказа-адказу. Вучням можна прапанаваць наступны тэкст:

### *Зімой у лесе*

*Снег ішоў усю ноч. Лес стаў падобны на казку. Якіх толькі звяроў не наляпіў снег! Тут можна ўбачыць незвычайную вавёрку. Вось яна прытаілася на галінцы. А гэта хто сядзіць на пні? Зайчык! Трохі далей прымасцілася нейкая дзіўная снежная птушка. Дружна папрацавалі снег з марозам доўгай студзеньскай ноччу! (50 слоў)*

У ходзе падрыхтоўкі пераказу на дошцы запісваюцца наступныя пытанні:

| **Пытанні** | **Апорныя словы** |
|---|---|
| *Чаму лес стаў падобны на казку?* | *снег, усю ноч;* |
| *Якіх звяроў наляпіў снег?* | *незвычайную вавёрку, прытаілася на галінцы, сядзіць на пні, зайчык, прымасцілася, снежная птушка;* |
| *Як папрацавалі снег з марозам?* | *дружна, студзеньскай ноччу* |

Вучні II класа рыхтуюць і запісваюць усе пераказы пад кіраўніцтвам настаўніка.

У **III класе** праца над падрабязным пісьмовым пераказам ускладняецца. Школьнікі пераказваюць тэкст па калектыўна складзеным плане і апорных словах. Настаўнік павінен прааналізаваць выбраны тэкст, выявіць яго асаблівасці, якія неабходна перадаць пры пераказе, і цяжкасці, з якімі могуць сутыкнуцца дзеці.

Вучням можна прапанаваць наступны тэкст:

### *Кармушка*

*У суботу Дзяніска з татам майстравалі кармушку. Атрымалася сапраўдная хатка для птушак.*

*У нядзелю было сонечна. Яны прымацавалі хатку на балконе. Вераб'ям накрышылі хлеба. Сініцам паклалі сала. Праз некалькі хвілін верабей ужо знайшоў ежу. Ён весела чырыкнуў і паляцеў клікаць сяброў. Вераб'і падсілкаваліся хлебам, пакінулі сала сініцам і паляцелі. Сінічкі пачаставаліся салам.*

*Адна птушачка падляцела да шыбы. Яна паківала галоўкай, асцярожна стукнула дзюбай у шкло. Так сінічка падзякавала людзям. (70 слоў)*

*Паводле Т. Мушынскай.*

Неабходна адзначыць, што ўвесь тэкст — апавяданне. Ёсць сюжэт, але дзеяння мала. У другім абзацы прапанавана невялікая пейзажная замалёўка: *У нядзелю было сонечна*. У гэтым жа абзацы расказваецца пра тое, як птушкі заўважылі кармушку і пачалі ласавацца прапанаваным пачастункам. Кампазіцыя простая: паведамленне пра тое, як Дзяніска з татам змайстравалі кармушку; апавяданне пра частаванне птушак; падзяка птушкі. У мове апавядання патрабуе тлумачэння толькі значэнне слоў *падсілкаваліся*, *шыба*. Да ліку цяжкасцей тэксту можна аднесці: спалучэнне складанага дзейніка з выказнікам у сказе *У суботу Дзяніска з татам майстравалі кармушку* (неабходна засяродзіцца на тым, што дзеяслоў у сказе ўжываецца ў форме множнага ліку); выраз *падзякавала людзям* (важна звярнуць увагу на асаблівасці кіравання ў беларускай мове); няпоўныя сказы *Вераб'ям накрышылі хлеба. Сініцам паклалі сала* ў другім абзацы; у другім і трэцім абзацах ёсць сказы, па сваёй структуры незнаёмыя дзецям (*У нядзелю было сонечна* — аднасастаўны сказ, *Ён весела чырыкнуў і паляцеў клікаць сяброў. Вераб'і падсілкаваліся хлебам, пакінулі сала сініцам і паляцелі. Яна паківала галоўкай, асцярожна стукнула дзюбай у шкло* — сказы з аднароднымі членамі).

Пасля аналізу тэксту настаўніку неабходна спланаваць работу з навучэнцамі:

**1.** Паведамленне мэты. Перад дзецьмі ставіцца задача перадаць гэтае апавяданне блізка да тэксту ўзору. *(Сёння мы з вамі будзем рабіць падрабязны пераказ апавядання Т. Мушынскай "Кармушка". Як вы думаеце, пра што пойдзе размова ў тэксце, мяркуючы па назве? Каму людзі робяць кармушкі? Калі майструюць кармушкі для птушак? Чаму?)*

**2.** Папярэдняе тлумачэнне слоў. *(У тэксце вам сустрэнуцца словы* ***падсілкаваліся***, ***шыба****. Хто можа растлумачыць іх значэнне? Падсілкаваліся — падмацаваліся, падкарміліся; шыба — шкло ў акне.)*

**3.** Чытанне тэксту. Пасля кожнага абзаца робіцца невялікая паўза. Выразна інтануюцца сказы з аднароднымі членамі.

**4.** Гутарка па змесце: *Для чаго Дзяніска з татам вырашылі зрабіць кармушку? Чым яны частавалі вераб'ёў і сінічак? Што зрабіла сінічка пасля частавання? Разбяром апавяданне па парадку. Пра што гаворыцца ў пачатку тэксту? (Пра тое, як Дзяніска з татам майстравалі кармушку.) Што апісваецца далей? (Птушкі заўважылі кармушку. Вераб'і частаваліся хлебам, а сінічкі — салам.) Як сінічка падзякавала людзям? (Яна падляцела да шыбы, паківала галоўкай, асцярожна стукнула дзюбай у шкло.)*

**5.** Калектыўнае складанне плана.

*План.*

*1) Праца над кармушкай.*
*2) Частаванне птушак.*
*3) Падзяка птушкі.*

**6.** Самастойнае складанне тэксту па пунктах плана і апорных словах. Апорныя словы настаўнік запісвае на дошцы побач з адпаведнымі пунктамі плана:

*1) майстравалі кармушку, хатка для птушак;*

*2) было сонечна, на балконе, накрышылі хлеба, паклалі сала, знайшоў, весела чырыкнуў, паляцеў па сяброў, падсілкаваліся хлебам, пачаставаліся салам;*

*3) падляцела да шыбы, паківала, стукнула ў шкло, падзякавала людзям.*

Спачатку дзеці складаюць сказы, выбіраюць неабходныя словы, замяняюць некаторыя словы і словазлучэнні сінанімічнымі, спрабуюць звязаць сказы паміж сабой. У гэты ж час звяртаецца ўвага на тое, што ў сказе *У суботу Дзяніска з татам майстравалі кармушку* выказнік ужываецца ў форме множнага ліку, што па-беларуску трэба гаварыць *падзякавала людзям*.

**7.** Праводзіцца арфаграфічная работа са словам *нак**ры**шылі*, папярэджваюцца пунктуацыйныя памылкі вучняў у сказах з аднароднымі членамі.

Папярэдні ўсебаковы аналіз выбранага для пераказу тэксту дазваляе надаць большую мэтанакіраванасць працы на ўсіх этапах падрыхтоўкі і напісання пераказу.

Хоць падрабязны, блізкі да тэксту пераказ і лічыцца параўнальна лёгкім практыкаваннем, але ён праводзіцца і ў IV класе, і пазней, паколькі ў яго ёсць свае функцыі ва ўдасканаленні дзіцячага маўлення. Пры падрабязным пераказе дзеці вучацца звяртаць увагу на дэталі ў тэксце, будаваць апавяданне, уводзіць элементы апісання, перадаваць дыялог, выкарыстоўваць выяўленчыя сродкі мовы. Школьнікі вучацца будаваць тэкст, захоўваючы часавую паслядоўнасць, прычынна-выніковыя сувязі, правільныя прасторавыя адносіны. Усё гэта развівае разумовыя здольнасці вучняў.

У **IV класе** праца над падрабязным пісьмовым пераказам ускладняецца. Дзеці пераказваюць тэкст па калектыўна складзеным плане без прапанаваных настаўнікам апорных слоў.

Навучэнцам можна прапанаваць наступны тэкст:

***Памочнік***

*Сумна Андрэйку ў хаце. Бацькі на рабоце, а ў яго — зімовыя канікулы.*

*За акном падаў снег. Пасля абеду яго намяло ўжо па калені.*

*Андрэйка абуў валёнкі, апрануў паліто, выйшаў на двор. Хлопчык узяў драўляную лапату і пачаў працаваць. Спачатку прачысціў дарожку да хлява, потым да калодзежа.*

*Скончыў адкідаць снег на падворку, успомніў пра бабку Агату. Хлопчык падаўся цераз вуліцу на бабчын двор. А там вышэй за Андрэйку снежная гурба ўздыбілася. Ледзь з ёй справіўся, параскідаў снег убакі.*

*Вечарам да іх завітала бабка. Яна паклала на стол дзве вялікія антонаўкі. (90 слоў)*

*Паводле Я. Галубовіча.*

Настаўнік адзначае для сябе, што ўвесь тэкст — апавяданне. У другім абзацы прапанавана невялікая пейзажная замалёўка: *За акном падаў снег. Пасля абеду яго намяло ўжо па калені.* Кампазіцыя простая: паведамленне пра тое, што Андрэйку было сумна на зімовых канікулах, пакуль не пайшоў снег; расказ пра тое, як хлопчык разграбаў снег у двары; паведамленне пра дапамогу бабцы Агаце; падзяка бабкі. У мове апавядання патрабуе ўдакладнення значэння слоў *падворак, гурба, уздыбілася.* Да ліку цяжкасцей тэксту можна аднесці: складаны сказ — *Бацькі на рабоце, а ў яго — зімовыя канікулы;* няпоўныя сказы — *Спачатку прачысціў дарожку да хлява, потым да калодзежа. Скончыў адкідаць снег на падворку, успомніў пра бабку Агату. Ледзь з ёй справіўся, параскідаў снег убакі*; аднасастаўныя сказы — *Сумна Андрэйку ў хаце. Пасля абеду яго намяло ўжо па калені.*

Пасля аналізу тэксту настаўніку неабходна спланаваць работу з навучэнцамі:

**1.** Паведамленне мэты. Перад дзецьмі ставіцца задача перадаць гэтае апавяданне блізка да тэксту ўзору. *(Сёння мы з вамі будзем рабіць падрабязны пераказ апавядання Я. Галубовіча “Памочнік”. Каго называюць памочнікам? Як вы думаеце, пра што пойдзе размова ў тэксце, мяркуючы па назве?)*

**2.** Папярэдняе тлумачэнне слоў. *(У тэксце вам сустрэнуцца словы **падворак**, **гурба**, **хлеў**. Хто можа растлумачыць іх значэнне? Падворак — двор каля дома; гурба — сумёт, гара снегу; хлеў — памяшканне для жывёлы.)*

**3.** Чытанне тэксту. Пасля кожнага абзаца робіцца невялікая паўза. Выразна інтануюцца складаны сказ, сказы з аднароднымі членамі.

**4.** Гутарка па змесце: *Чаму Андрэйку было сумна на зімовых канікулах? Які занятак ён знайшоў сабе пасля абеду? Раскажыце, як хлопчык адкідаў снег. За што падзякавала Андрэйку бабка Агата? Як яна гэта зрабіла? Чаму тэкст называецца “Памочнік”? Разбяром апавяданне па парадку. Пра што гаворыцца ў пачатку тэксту? (Пра тое, як Андрэйка сумаваў на зімовых канікулах.) Што апісваецца далей? (Як паўдня падаў снег.) Што вырашыў зрабіць Андрэйка? (Ён вырашыў прачысціць ад снегу дарожкі ў двары). Чым заняўся хлопчык, калі паадкідаў снег на падворку? Што адбылося ўвечары?*

**5.** Калектыўнае складанне плана. Напрыклад:

*План*

*1) Сумна Андрэйку.*
*2) Снегу намяло.*
*3) Знайшлася справа ў двары.*
*4) Суседцы патрэбна дапамога.*
*5) Падзяка бабкі.*

**6.** Самастойнае складанне частак тэксту па пунктах плана.

Звяртаецца ўвага на тое, пра што трэба расказаць у першай частцы пераказу, якімі сінонімамі можна замяніць прыслоўе *сумна (нудна, маркотна)* у сказе. Засяроджваецца ўвага вучняў на тым, што ў сказе слова *Андрэйка* ўжываецца ў давальным склоне з канчаткам *-у*. Паказваецца, як пры пераказе першай часткі можна пазбегнуць выкарыстання няпоўных і складаных сказаў (напрыклад: *Сумна Андрэйку ў хаце ў зімовыя канікулы. Бацькі працуюць.*)

Акцэнтуецца ўвага на перадачы апісання ў другой частцы тэксту. Звяртаецца ўвага дзяцей на словы, якія падказваюць, што снегу вакол было шмат *(намяло ўжо па калені)*.

Акрэсліваецца змест трэцяй часткі. Дзеці назіраюць за лексічнай спалучальнасцю слоў у словазлучэннях *абуў валёнкі* і *апрануў паліто*.

Навучэнцы абмяркоўваюць магчымасць сінанімічнай замены дзеяслова *падаўся (пайшоў, рушыў, накіраваўся)* у сказе *Хлопчык падаўся цераз вуліцу на бабчын двор* чацвёртай часткі. Звяртаецца ўвага на тое, што па-беларуску трэба гаварыць *вышэй за Андрэйку*.

Пры вызначэнні зместу апошняй часткі ўвага вучняў акцэнтуецца на тым, што па-беларуску гаворыць *завітала да іх, дзве вялікія антонаўкі*.

**7.** Праводзіцца арфаграфічная работа са словамі *вы**й**шаў, прачы**сці**ў, **дзв**е, баб**чы**н, ле**дзь**, **сп**ачатку, **уб**акі*, папярэджваюцца пунктуацыйныя памылкі вучняў у сказах з аднароднымі членамі.

Пры навучанні пісьмовым пераказам трэба памятаць, што іх роля заключаецца ў тым, каб на фоне пастаяннай і разнастайнай вуснай маўленчай дзейнасці трэніраваць навучэнцаў у абдумванні і складанні тэкстаў. Пісьмовыя пераказы дапамагаюць далучыць дзяцей да лепшых узораў мовы. Тэксты, створаныя майстрамі слова і затым пісьмова пераказаныя дзецьмі, спрыяюць фарміраванню маўленчых навыкаў, павышаюць культуру маўлення, прывіваюць мастацкі густ, развіваюць чуццё мовы.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Львов, М. Р. Основы теории речи : учеб. пособие / М. Р. Львов. — М. : Академия, 2000. — 248 с.
2. Львов, М. Р. Речь младших школьников и пути ее развития : пособие для учителей / М. Р. Львов. — М. : Просвещение, 1975. — 176 с.
3. Методика преподавания русского языка в национальной школе : учеб. пособие для учащихся нац. групп пед. уч-щ / Л. З. Закирова, Л. Г. Саяхова, К. З. Закирьянов и др. ; под ред. Л. В. Шакировой. — Л. : Просвещение. Ленингр. отд-ние, 1990. — 416 с.
4. Методика преподавания русского языка в начальных классах : учеб. пособие для студ. высш. пед. учеб. заведений / М. Р. Львов, В. Г. Горецкий, О. В. Сосновская. — 2-е изд, испр. — М. : Академия, 2002. — 464 с.